# Моладзь працуе

### В. Слабодка–Кучанка Пукаўскай вол. Слуцкага пав.

Глыбока пусьціў карэньні ў нас культурна–асьветны гурток „Чырвоны шлях“, заснаваны яшчэ ў 17–м годзе. Яго слаўныя традыцыі барацьбіта на культурна–асьветным фронце сьвята захоўваюцца моладзьдзю. І вось, пасьля чарговага летняга супачынку, гурток распачаў зноў сваю працу. На багатніка 21 верасьня поп правіў абедню ў нашай царкве, а моладзь уладзіла ў магазыне спэктакль.

—Паглядзім, у каго больш будзе народу, — гаварылі нашы хлопцы.

І ў магазыне было народу паўнюсенька. Шмат было і з суседніх вёсак. Ішла п’еса „Зубная хвароба“. Асабліва адзначыліся сваёй добраю ігрою Рыгор Якубкавых, Пётрык Акіліных, Валодзя Пятруськавых і Ільлюк, а з дзяўчат Таня, Люба, Волька і Анэта.

Сяляне казалі:

— Добра, вельмі добра.

Моладзь цяпер ахвотна ўваходзіць у гурток. Складаецца новая капэля музыкі, яшчэ дагэтуль ня чуваная ў нашай вёсцы. Гітара, мандаліна і балалайка ў наступную нядзелю агалосіць наш стары, але сэрцам малады, магазын.

Толькі поп дык цяпер чухаецца.

Кепскія пайшлі, кажа, часы. Адаб’юць зусім народ ад царквы.

Адна толькі замінка ў нашым гуртку — гэта нястача літаратуры. Трэба было–б Палітасьвету зьвярнуць увагу і падсыпаць нам патрэбных кніжок; мы шчыра за гэта аддзячым сваёю працаю.

*1923*